# Як заснаваць фонд?

**Напачатку: імпульс, ідэя, патрэба**

**Фундатар (ці фундатары) маюць ідэю, як займацца грамадскай дзейнасцю.**

***Фундатар не мусіць быць прапісаны ў Польшчы.***
***Ва ўладах фонду могуць быць іншаземцы, напрыклад, беларусы.***

## 1-шы крок: нумар у Агульнапольскім судовым рэестры (нумар КРС)

**Устаўны фонд**

Няма сталай сумы, якую неабходна мець у кішэні (фонд без гаспадарчай дзейнасці – 500 – 1000 злотых, але можа быць менш).

Фонд з гаспадарчай дзейнасцю – на ўстаўны фонд дадаткова мінімум 1000 злотых.

**Фундацыйны акт**

Фундатар робіць яго ў натарыуса, за гэта ажыццяўляецца аплата мінімум 100 злотых.

Фонд можна заснаваць у завяшчанні.

**Статут**

Фундатар прымае статут.

**Праўленне**

Фундатар выбірае праўленне. Ён можа склікаць і рэвізійную камісію, раду фонду (гэта неабавязкова, але варта яе выбраць).

**Рэгістрацыйная заява ў КРС**
**– Агульнапольскі судовы рэестр**

**фармуляры**
KRS-W20, KRS-WK

Фонд з гаспадарчай дзейнасцю – рэгістрацыя праз партал судовых рэестраў (PRS): prs.ms.gov.pl

**дадаткі**
- 3 экз. статута фонду
- натарыяльны акт
- рашэнне фундатара аб прыняцці статута
- рашэнне аб выбары ўлад (праўленне, рэвізійная камісія)
- рэгістрацыйная аплата ці заява з просьбай вызваліць ад яе
- заява сяброў праўлення аб адрасах для ўручэння карэспандэнцыі (калі адрас па-за межамі ЕС, неабходна ўказаць польскага прадстаўніка)
- згода сяброў праўлення на балаціраванне
- заява аб выбары міністра

**Рэгістрацыйныя выдаткі ў КРС**

Фонд без эканамічнай дзейнасці: 250 злотых
Фонд з эканамічнай дзейнасцю: 600 злотых

**Час рэгістрацыі**

Як правіла, 1 – 1,5 месяцы (часамі хутчэй)

## 2 крок: банкаўскі рахунак, дадатковыя дадзеныя

**банкаўскі рахунак** у любым банку

**Дадатковыя дадзеныя**

У падатковай інспекцыі трэба запоўніць фармуляр NIP-8.

Гэта новыя дадзеныя, яшчэ невядомыя падчас рэгістрацыі ў КРС, напрыклад, нумар банкаўскага рахунка.

### НАПЕРАД!

Фармальна можна пачынаць дзейнічаць – ёсць статут, нумар КРС, РЭГОН (Рэестр нацыянальнай эканомікі Польшчы), НІП (Падатковы ідэнтыфікацыйн нумар у Польшчы), банкаўскі рахунак. Цяпер патрэбныя энергія і ідэі.

### УВАГА:

Разам з нумарам КРС выдаюць нумары: РЭГОН і НІП – для іх атрымання ўжо не трэба ісці ў іншыя ўстановы.

падрабязней: **poradnik.ngo.pl**

крыніца: **ngo.pl**